Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “Словаўтварэнне дзеясловаў. Правапіс суфіксаў дзеясловаў”

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗМЕСТ

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Словаўтварэнне дзеясловаў

1.2. Правапіс суфіксаў дзеясловаў

1.3. Марфалагічны разбор дзеяслова

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Словаўтварэнне дзеясловаў

Дзеясловы падзяляюцца на невытворныя і вытворныя: *гаварыць, несці; вячэраць, жартаваць*. Для дзеясловаў больш прадуктыўны ***прэфіксальны (прыставачны)*** спосаб утварэння. Пры гэтым выкарыстоўваецца больш за 20 розных прыставак, якія служаць для ўнутрыдзеяслоўнага ўтварэння (дзеясловаў ад дзеяслова): *ажыць, апісаць, абагнаць, адкрыць, выкінуць, даляцець, зрабіць, прынесці*.

***Суфіксальным*** спосабам дзеясловы ўтвараюцца ад асноў назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, выклічнікаў: *жарт – жартаваць, госць – гасцяваць, плата – плаціць, два – дваіць, ох – охаць, мяў – мяўкаць*.

Многія дзеясловы ўтвараюцца ад асноў назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў (***прыставачна-прэфіксальным***) ***прыставачна-суфіксальным*** спосабам: *дождж – задаждждыць, снег – аснежыць, соль – абяссоліць, круглы – закругліць*.

### 1.2. Правапіс суфіксаў дзеясловаў

[Пры напісанні працы быў выкарыстаны матэрыял “Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”- Мінск, 2008 –144 с.]

1. Пераважная большасць запазычаных дзеясловаў ужываецца з суфіксам *-ава- (-ява-): дэградаваць, фальсіфікаваць, арыентаваць, прагназаваць, балансаваць, цытаваць, аналізаваць, іранізаваць, культываваць, кантактаваць, планаваць, групаваць, нацыяналізаваць, прыватызаваць, дэкларaваць, ліквідаваць, акліматызаваць, перафразаваць, кваліфікаваць, інфармаваць, урбанізаваць, каталізаваць, функцыянаваць, ваенізаваць, кантраляваць, тыпізаваць, паразітаваць, фінансаваць, тыражаваць, ігнараваць, рэагаваць, кансультаваць, прафіляваць, ангажаваць, нерваваць, абстрагаваць, імпартаваць, дэбатаваць, дэбютаваць, інспектаваць, экспартаваць, рэканструяваць, дыскутаваць, правакаваць, фінішаваць.*

2. Дзеяслоўны суфікс -*ірава*- (-*ырава-*) ужываецца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- калі без гэтага суфікса ўзнікае аманімія дзеясловаў з дзеясловамі з суфіксам *-ава- (-ява-): буксіраваць — буксаваць, парадзіраваць — парадаваць, візіраваць — візаваць, будзіраваць — будаваць, газіраваць — газаваць, камандзіраваць — камандаваць, пазіраваць — пазаваць, пасіраваць — пасаваць, тушыраваць — тушаваць, парыраваць — параваць, паніраваць — панаваць, фарміраваць — фармаваць, апаніраваць — апанаваць*;

- калі дзеяслоў без *-ір- (-ыр-)* губляе сваю фармальную і семантычную акрэсленасць: *шакіраваць, бісіраваць, бравіраваць, гарманіраваць, драпіраваць, лабіраваць, грасіраваць, курыраваць, лавіраваць, дэкарыраваць, сервіраваць, фантазіраваць, лакіраваць, штудзіраваць, мусіраваць, татуіраваць* і інш.;

- калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне: *манціраваць, пасівіраваць, аксідзіраваць, зандзіраваць, дэкаціраваць, сталіраваць, дэмпфіраваць, юзіраваць, юсціраваць, парафіраваць, дыфундзіраваць*.

У некаторых выпадках паралельна ўжываюцца дзве формы: *дэмаскіраваць — дэмаскаваць, акупіраваць — акупаваць, курсіраваць — курсаваць, калькіраваць — калькаваць, базіраваць — базаваць*.

3. Суфікс *-ава- (-ява-)* пішацца ў неазначальнай форме і формах прошлага часу тых дзеясловаў, якія ў першай асобе адзіночнага ліку губляюць гэты суфікс і заканчваюцца на *-ую (-юю)*: *галасую — галасаваць, галасаваў, галасавала, галасавалі, начую — начаваць, чаргую — чаргаваць, малюю — маляваць, камандую — камандаваць, пакутую — пакутаваць, даследую — даследаваць, будую — будаваць, рэкамендую — рэкамендаваць, характарызую — характарызаваць.*

4. Суфікс *-іва- (-ыва-)* пішацца ў неазначальнай форме і асабовых формах цяперашняга часу дзеяслова, а таксама ў формах прошлага часу незакончанага трывання пасля збегу зычных, апошні з якіх *л, р* або *н*: *падкрэсліваць, падкрэсліваю, падкрэсліваў, падкрэслівалі; падтрымліваць, адыгрываць, выветрываць, запэўніваць, адрозніваць*.

5. Суфікс *-ва-* пішацца ў астатніх выпадках: *выконваць, выконваю, выконваў, выконвалі; адказваць, вымешваць, адмерваць, заканчваць, загадваць, адорваць, разбэшчваць, падстрэльваць, раздумваць, заваёўваць, зацярушваць, дагульваць, размяркоўваць, забінтоўваць, распілоўваць*.

У дзеясловах выйграваць і прайграваць пішацца суфікс *-ава-*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Калі неазначальная форма дзеяслова закончанага трывання заканчваецца на -*іць* або -*яць* з папярэдняй галоснай, то ў незакончаным трыванні перад суфіксам -*ва*- пішацца *й:утаіць — утойваць, супакоіць — супакойваць, засвоіць — засвойваць, узброіць — узбройваць, напаіць — напойваць, склеіць — склейваць, абнадзеіць — абнадзейваць; засеяць — засейваць, абсмяяць — абсмейваць, запаяць — запайваць, настаяць — настойваць.*

### 1.3. Марфалагічны разбор дзеяслова

1. Дзеяслоў у сказе
2. Пачатковая форма (інфінітыў)
3. Аснова інфінітыва ці цяперашняга (простага будучага) часу
4. Пераходны ці непераходны
5. Зваротны ці незваротны
6. Стан (незалежны ці залежны)
7. Трыванне (закончанае ці незакончанае)
8. Лад (абвесны, умоўны, загадны)
9. Час (цяперашні, прошлы, будучы)
10. Асабовыв ці безасабовы
11. Асоба
12. Лік
13. Спражэнне
14. Род
15. Сінтаксічная функцыя ў сказе

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

*1. Якія дзеясловы называюцца вытворнымі, а якія невытворнымі?*

*2. Ахарактарызуйце прэфіксальны спосаб утварэння дзеясловаў.*

*3. Ахарактарызуйце суфіксальны спосаб утварэння дзеясловаў.*

*4. Ахарактарызуйце прэфіксальна-суфіксальны спосаб утварэння дзеясловаў.*

*5. Як правільна напісаць дзеяслоў ліквідаваць ці ліквідзіраваць? Абгрунтуйце адказ.*

*6. У якіх выпадках пішуцца суфіксы –ава(-ява), –іва(-ыва) і калі ўжываецца суфіксі –ва?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*7. У якой паслядоўнасці трэбы выконваць марфалагічны разбор дзеяслова?*

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Выпішыце спачатку дзеясловы, утвораныя пры дапамозе прыставак, потым – пры дапамозе суфіксаў, пасля – пры дапамозе прыставак і суфіксаў.**

Адрозніваць, асвятляць, аплачваць, званіць, заплаціць, грузіць, паабедаць, бяліць, бялець, чарніць, чарнець, славіць, пасеяць, адсвяткаваць, уздыхнуць, узаконіць, падпяваць, сябраваць, вырашыць, ушаноўваць, узмацніць, укараніць, нумараваць, угаворваць, завезці, цямнець, стукнуць.

**Заданне 2. Ад кожнай з прыведзеных часцін мовы ўтварыце дзеясловы прэфіксальна-сукфіксальным спосабам. Зрабіце марфемны разбор утвораныхз дзеясловаў.**

I. Знак, імгла, пан, каталік, снег, кара, закое, зброя, лес, доля.

II. Бедны, новы, порамы, смелы, ціхі, просты, жывы, керуглы, сіні.

III. Стукаць, мяшаць, званіць, гуляць, танцаваць, ляпіць, гаварыць, драмаць, калыхаць.

**Заданне 3. Пастаўце дзеясловы ў неазначальнай форме і ў прошлым часе, запішыце іх, абазначце суфіксы.**

Будую, атакую, гарантую, галасую, рыхтую, даследую, дзякую, рамантую, габлюю, начую, зімую, малюю, святкую, кірую, фармулюю, рэдагую, патрабую, спрабую, хітрую, гадую, палюю, гарантую, даследую, тынкую, любуюся, друкую, турбую, прапаную, крытыкую, камандзірую, жую, кую.

**Заданне 4. Перакладзіце дзеясловы на беларускую мову і запішыце іх. Вусна растлумачце правапіс суфіксаў дзеясловаў.**

Переписывать, перечитывать, разменивать, вспахивать, оклеивать, выдумывать, проветривать, выплывать, показывать, завязывать, рассказывать, отгадывать, подкармливать, упрашивать, отстаивать, выполнять, раскапывать, надаивать, уговаривать, подмораживать, вылавливать, задерживать, предупреждать, возглавлять.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ